Rzeczpospolita Polska Ministerstwo Spraw Zagranicznych

Gdańska Fundacja Oświatowa

International School of Gdansk

# Сцэнар Урока/ Прапанова праекту*

| | |
|---|---|
| **Краіна-партнэр** | Польшчы |
| **Тэма ўроку** | Як зьмяніць нашую школу?Прастора вакол нас - школа |
| **Рэкамэндаваная велічыня групы** | 20-30 вучняў |
| **Рэкамэндаван ўзрост вучняў** | Ад 12 год |
| **Рэкамэндаваны час** | 90 хв. |
| **Мэты** | • Крытычны погляд на прастору<br>• Акрасьленьне прасторы, якая вымагае зьмены ў школе<br>• Разьвіцьцё навукаў праектаваньня зьменаў<br>• Разьвіцьцё ўражлівасьці на прастору, што нас атачае. |
| **Мэты ўрока** | Пасьля ўрока вучань павінен:<br>• Пералічвае розныя прасторы школы і іх розныя функцыі.<br>• Можа аргумэнтаваць патрэбы ўвядзеньня зьменаў у дадзенай прасторы<br>• Можа арганізоўваць прастору, з каторай ён сам карыстаецца. |
| **Матэрыялы** | • 7 вялікіх аркушаў паперы<br>• Маленькія карткі ў двух колерах<br>• Пісьмовыя прылады |

**Увядзеньне:**
Прээзнтуйце вучням тэму лекцыі. Скажыце, што падчас заняткаў вы прыглядзіцеся бліжэй прасторы вашай школы і падумаеце, як можна нешта зьмяніць, каб яе лепш выкарыстоўваць.

**Заданьні настаўніка:**

1. Скажыце, што напачатку стварыце мапу школы, акрэсьліце функцыі, заданьні, якія выконвае прастора школы і патрэбы яе карытсальнікаў – вучняў, настаўнікаў, бацькоў, інўых асобаў, што працуюць у школе. Зрабіце гэта працуючы мэтодыкай кавярні.

- Падзяліце клясу на 4 групы. Падрыхтуйце 4 месцы працы, каторыя будуць адпавядаць кожнаму канкрэтнаму заданьню. На трох першых падрыхтуйце вялікія аркушы паперы і матэрыялы да пісаньня. Падзяліце тэрыторыю штолы на некалькі абшараў, нп. Першы паверх, другі, тэрыторыя вакол школы. Кожнаму з гэтых трох пунктаў прыпішыце адзін абшар працы. Заданьнем асобаў, што тут працуюць, будзе намаляваць мапу дадзенага абшару. На чацьвёртым пункце падрыхтуйце маленькія карткі ў дзьвух колерах. Заданьнем вучняў будзе напісаць на картках аднаго колеру ўсіх дзеяньняў, каторыя усе карыстальнікі школы ў ёй робяць (нп.

**Заданьні вучня/вучняў**

**Мапа школы і выкарыстаньне прасторы школы (45 хв.)**

- (5 хв) Кляса знаёміцца з тэматыкай урока, пасьля супольна рыхтуецца да працы – рыхтуе месцы працы, дзеліцца на 4 групы.
- (20 хв) Асобныя групы праходзяцца праз усе пункты працы, а потым ствараюць галерэю, што прадстаўляе мапы школы.
- (10 хв) Кляса супольна прыклейвае паперы, каторыя апісваюць тое, што ў дадзенай прасторы як карыстальнікі робяць, а навокал мапы – тое, што хацелі б яшчэ рабіць..
- (10 хв) Вучні бяруць удзел у гутарцы на тэму паўсталай мапы.

80-842 Gdańsk, ul. Osiek 11/12, tel./fax (58) 305-80-60, 305-80-61, www.gfo.pl gfo@gfo.pl

*Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.*

| | |
|---|---|
| Вучацца, размаўляюць, робяць хатнія заданьні, рыхтуюць спэктаклі), а на паперы іншага колеру – што яшчэ хацелі б рабіць.<br>• Кожная група пачынае працу пры адным з пунктаў, пасьля па сыгнале настаўніка пераходзіць а наступнага пункта і працягвае працу папярэдняй групы. Такім чынам усе 4 групы працуюць пры ўсіх 4 пунктах.<br>• Пасьля сканчэньян гэтай працы, ствараецца галерэя мапаў школы. Супольна прыклейце карткі з інфармацыяй, што удзельнікі робяць ў адпаведніх месцах. У выпадку, калі адно дзеяньне выконваецца ў некалькіх месцах, стварце дадатковыя карткі з гэтай дзейнасьцю. Паперкі з тым, што хацелі б рабіць прыклейваюцца вакол мапы.<br>• Падсумоўваючы, прыглядзіцеся да супольна паўстаўшай мапы школы. Спытайце, ці штосьці вучняў зьдзівіла, ці адкрылі яны для сябе на тэрыторыі школы нешта новага, аб чым раней ня думалі.<br><br>Перапынак<br><br>2. Скажыце вучням, што шукаеце супольна месца ў школе, каторае найбольш хацелі б зьмяніць. Паінфармуйце іх, што зробіце гэта пры дапамозе піраміды. Настаўнік мадэруе практыкаваньне, зьвяртае ўвагу на чам, можа хутчэй перайсьці да працы ў большых групах.<br>• Папрасіце вучняў, каб кажды індывідуальна напісаў на картцы 5 месцаў, каторыя хацеў бы зьмяніць.<br>• Пасьля папрасіце, каб у парах абмеркавалі тое, чаму менавіта гэтыя месцы і з 10 прапановаў выбралі 5 агульных. Ад гэтага часу будуць разам прэзэнтаваць гэтую прапанову.<br>• Папрасіце, каб вучні стварылі 4асабовую групу, прэзэнтавалі узаемны вынік і супольна выбралі 5 месцаў.<br>• Злучайце групы ад да таго моманту, пакуль дойдзе да прэзэнтацыі і дыскусіі 2 групаў і акрасьленьня супольных 5 месцаў.<br>• Пазьней абярыце на форум адно месца над зьменай каторага будзеце разам працаваць у далейшай частцы заняткаў.<br>• На заканчэньне заданьня кожны вучань пазначае на мапе школы тыя месцы, каторыя сам першапачаткова выбраў.<br><br>3. Запрасіце вучняў да супольнага праетаваньня зьмены абранай пpасторы. Папрасіце, каб нехта зьвярнуў увагу на ролю, што выконвае гэта месца ( яна можаў часе праектаваньня зьмяніцца), карыстальнікаў, рэальнасьць рэалізацыі ідэі – хто яго можа зрэалізаваць, што патрэбна для ўвядзеньня гэтай зьмены? | **Ідэнтыфікацыя месцаў, каторыя патрабуюць зьменаў (20 хв)**<br>• (15 хв) Вучні супольна вызначаюць месцы, каторыя патрабуюць зьменаў. Пачынаючы ад індывідуальнай працы, праз працу ў малых групах і на форум.<br>• (5 хв) Вучні пазначаюць на мапе месцы, каторыя самі абралі.<br><br>**Праектаваньне зьменаў (25 хв)**<br>• (10 хв) Вучні дзеляцца на 3 групы. Рыхтуюць праект у форме эскіза з апісаньнем зьмены дадзенага месца.<br>• (15 хв) Асобныя групы прэзэнтуюць свае прапановы і дыскутуюць на тэму магчымасьці іх рэалізацыі. |



*Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.*

| | |
|---|---|
| • Падзялце вучняў на 3 групы. Заданьнем кожнай будзе праектаваньне зьменаў дазенай прасторы. Узор з дададзеным апісаньнем функцыяў і карыстальнікаў гэтай прасторы пасьля яе зьменаў запісваюцца на вялікіх аркушах паперы.<br>• Калі ўпэўніцеся, што ўсе групы скончылі працу, запрасіце іх да прээзнтацыі сваіх праетаў на форум. Пасьля прээзнтацыі ўсіх ідэяўачыніце дыскусію на гэтую тэму – на якія патрэбы адпавядаюць, што можна зрабіць, каб увесьці іх у жыцьцё.. | |
| **Падсумаваньне:**<br>Зьвярніце ўвагу на рэальную магчымасьць зьменаў адзенай прасторы і на разнастайнасьць прапановаў на гэтую зьмену. Папрасіце, каб вучні ізноў прыглядзеліся да мапы і падумалі, што могуць зрабіць самі,каб прастора школы адпавяала іх патрэбам. Заахвоцьце да ініцыяваньня зьменаў вучнямі. Пазначце, што прастора школы пачынаецца а із уласнай клясы, іх крэсла, шафкі. | |

| |
|---|
| **Рэкамэндаваная ацэнка заняткаў: Sugerowana ocena zajęć:**<br><br>Актыўны ўдзел ва ўроку<br>Здольнасьць працы ў групе<br>Здольнасьць пошуку практычных і рэальных рашэньняў.<br><br>Назіраньне настаўнікам / выхавацелем клясы дбаньня аб прастору школы і ініцыяваньня зьменаў (пачынаючы ад прасторы, каторую ўжывае безпасярэдня дадзены вучань/вучаніца, нп. Шафа, крэсла і г.д.). |

*калі датычыцца іншых формаў заняткаў, то просім зьмяніць

Апрацаваньне: беларуская група, Эва Окроы

*Публікацыя выражае толькі погляды аўтара і ня можа быць трактаваная як афіцыйная пазыцыя Міністэрства Замежных Справаў РП.*



*Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.*